**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у маі**

**1 мая. ЦБ.** Для выхаванцаў дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН правялі майстар-клас па вырабу аб'ёмнай аплікацыі "Первомайская открытка". На мерапрыемстве прысутныя даведаліся пра гісторыю і традыцыі святкавання 1 мая, пазнаёміліся з кніжнай выставай "С праздником труда!"
**ЦДБ.** Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі падрыхтавалі анлайн-выступленне лялечнага тэатра па казцы "Воўчы хлеб", якую размясцілі на ютуб-канале "Лунінецкая цэнтральная бібліятэка".

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бюібліятэках. Так, у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшоў урок памяці "Шчаслівы май", у **Міжлескай** і **Бастынскай** сельскіх бібліятэках правялі конкурс малюнкаў сярод вучняў школ.

Прайшлі мерапрыемствы да свята **Светлай Пасхі.**

**3 мая. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры "Истоки" прайшлі пасхальныя пасядзелкі "Праздник света – праздник веры». Пра тое, як святкавалі Вялікдзень нашы продкі, як падрыхтавацца да свята, якія стравы прыгатаваць, як упрыгожыць вялікодныя яйкі прысутным расказалі супрацоўнікі бібліятэкі. Удзельнікі дзяліліся традыцыямі святкавання Вялікадня ў іх сем'ях, рэцэптамі велікоднай выпечкі. Заключэннем вячорак стаў майстар-клас па роспісу велікодных яек.

У бібліятэках прайшлі патрыятычныя мерапрыемствы і акцыі, прысвечаныя **Дню Перамогі і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**7 мая. Мікашэвіцкая г.б**. Адбыўся вечар ваеннай паэзіі "Никто в забвенье не уходит". Мерапрыемства прысвяцілі паэтам, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**8 мая. ЦДБ.** Прайшла гадзіна памяці "Это не должно повториться". Бібліятэкары расказалі школьнікам аб мужнасці і гераізме савецкіх салдат. Мерапрыемства суправаджалася паказам фільма "Как начиналась война. Первые четыре часа."

**8 мая. ЦРБ.** У рамках паседжання народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция» адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя "Поклонимся великим тем годам…" У пачатку мерапрыемства ўдзельнікі студыі прадставілі тэатралізаваную пастанову "Партызанскі атрад", прысвечаную 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Далей удзельнікі чыталі вершы пра вайну, абменьваліся гісторыямі ваенных гадоў, якія чулі ад сваіх блізкіх.

**9 мая. ЦБ. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэк арганізавалі бібліятэчную інтэрактыўную пляцоўку на гарадскім свяце "И снова Май. Салют. Победа!" Працавалі кніжные выставы «И память о войне нам книга оставляет», «Лунинетчина в годы Великой Отечественной войны», «Шагнувшие в бессмертие», выстава артэфактаў часоў Вялікай Айчыннай вайны "Эха вайны", выстава малюнкаў выхаванцаў арт-студыі "В фокусе палитры". Усе

жадаючыя змаглі прыняць удзел у акцыі “Напиши письмо ветерану”. Для дзяцей быў арганізаваны “Игровой привал» з гульнямі і разгадваннем крыжаванкі.

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню Дзяржаўнага флага, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.**

**10 мая. Міжлеская с.б.** Адбыўся гістарычны экскурс “В символах страны – история Отечества». Удзельнікі мерапрыемства даведаліся пра тое, што расказвае герб Беларусі, што абазначаюць колеры беларускага сцяга, даведаліся пра ролю і значэнне сімволікі ў жыцці кожнага чалавека.

**11 мая. ЦДБ.** Прайшла пазнавальная гадзіна “Священные атрибуты государства”, прысвечаная Дню Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага флага і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Дзецям расказалі пра дзяржаўныя сімвалы, пазнаёмілі з кніжнай выставай, правялі віктарыну “Колеры маёй Беларусі”, успомнілі прыказкі і прымаўкі пра Радзіму, адгадвалі загадкі і паглядзелі фільм “Дзяржаўныя сімвалы”.

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Міжнароднаму дню сям’і.**

**14 мая. ЦБ.** Для выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН правялі дзень сямейных зносін “Семья – любви великой царство”. Бібліёграф асвятліла пытанні прадастаўлення дзяржаўнай падтрымкі і гарантый сем’ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. А бібліятэкар правяла з удзельнікамі займальную віктарыну “Сям’я – гэта…” Мерапрыемства суправаджалася паказам відэасюжэтаў аб каханні і вернасці.

**15 мая. ЦДБ**. Для вучняў 1 “Б” класа СШ №1 адбылася гадзіна сямейных гісторый “Книга, я и моя семья».

**15 мая. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся круглы стол “Молодая семья и социальная политика государства”. У чытальнай зале сабраліся ўдзельнікі клуба маладых інвалідаў “САМИ” з бацькамі.

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Бастынская с.б.** адбылася акцыя-віншаванне “Под семейным зонтиком”, пад час якой прайшло ўшанаванне самых чытаючых сем’яў – сям’і Кошаль і сям’і Бушыла. У **Любачынскай с.б**. для выхаванцаў дзіцячага садка правялі гульнявую праграму “Ромашковый день”. Дзеці паказалі добрыя веды, адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі і літаратурныя творы аб сям’і. У **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла фальклорная гадзіна “Семья – это маленькая Вселенная”. У **Лунінскай, Рэдзігераўскай і Палескай сельскіх бібліятэках** адбыўся конкурс малюнкаў “Моя семья – моё богатство”. Удзельнікі конкурсу малявалі партрэт сваёй сям’і.

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Міжнароднаму дню музееў.** Так, **18 мая** у **Рэдзігераўскай сельскай бібліятэцы** арганізавалі экскурсію для навучэнцаў пачатковых класаў у міні-музей этнаграфіі і сялянскага побыту “Прылады даўніны”, які працуе пры бібліятэцы. У **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** экскурсія адбылася для вучняў 2-га класа ў этнаграфічны музей “Спадчына маіх дзядоў”. У **Любачынскай сельскай бібліятэцы** экскурсію правялі ў міні-музей для выхаванцаў дзіцячага сада.

**30 мая. ЦБ.** У вёсцы Сінкевічы адбыліся Свята–Георгіеўскія духоўна-краязнаўчыя чытанні. Супрацоўнікі центральнай раённай бібліятэкі прадставілі на мерапрыемстве кніжную выставу “Красота божьего мира.”
**31 мая. ЦБ.** На адктытай пляцоўцы кафэ “Блін-кава” ГЦ “Сити» адбыўся дабрачынны “Аўкцыён дзіцячай творчасці”, арганізаваны ў падтрымку дзейнасці арт-студыі “В фокусе палитры”, які працуе пры цэнтральнай раённай бібліятэцы. У студыі займаюцца дзеці і з асаблівасцямі развіцця, і звычайныя дзеці.

Прайшлі мерапрыемствы да **Сусветнага дню без тытуню**. Так, **31 мая** ў **Вулькаўскай-2 с.б.** прайшла інфармацыйная гадзіна “В плену табачного дыма”, у **Сінкевіцкай с.б.** – гадзіна інфармацыі “Дым, уносящий здоровье”, у **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** – пазнавальная гадзіна “Безвредного табака не бывает” і інш.